**Л.А.Дзямешка,** *дацэнт,*
**Н.У.Клімянкова,** *дацэнт,*
**С.А.Паўлава,** *дацэнт*

# ПРАЕКТНЫ МЕТАД НАВУЧАННЯ Ў ФАРМІРАВАННІ КРЭАТЫЎНАСЦІ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎЧЫХ ДЫСЦЫПЛІН

Мэта сучаснай вышэйшай школы – фарміраванне гуманнай, кампетэнтнай і крэатыўнай асобы. Таму студэнту неабходна пераходзіць ад паступовага і механічнага назапашвання ведаў да набыцця вопыту крэатыўнай дзейнасці ў працэсе навучання, што пераўтварае яго з аб’екта педагагічных намаганняў у свядомы суб’ект пазнання, самаадукацыі і самаўдасканалення.

Да асноўных стратэгій фарміравання вопыту крэатыўнай дзейнасці можна аднесці стварэнне ў ВНУ адукацыйнага асяроддзя, якое спрыяе максімальнаму раскрыццю асобы студэнта. Асноўная мэта крэатыўнага адукацыйнага асяроддзя – актуалізаваць у асобе студэнта творцу і максімальна развіваць у яго творчы патэнцыял.

Не менш важнай умовай фарміравання крэатыўнасці з’яўляецца актыўны ўдзел навучэнца ў рэалізацыі праграм і праектаў, якія непасрэдна звязаны з фарміраваннем творчага падыходу, асабістай крэатыўнасці. У працэсе фарміравання вопыту крэатыўнай дзейнасці павінна ажыццяўляцца наступная мэтанакіраваная работа: праектаванне, планаванне, спецыяльны адбор крэатыўных элементаў, якія паступова пераўтвараюцца ў цэласны творчы працэс.

Існуе мноства трактовак паняцця крэатыўнасці [1, с. 66; 2, с. 15; 3, с. 27; 4, с. 13]. Мы разумеем крэатыўнасць як інтэгральную ўстойлівую характарыстыку асобы, якая вызначае яе здольнасць да творчасці, засваення новага, нестандартнага мыслення, стварэння арыгінальных, прынцыпова новых ідэй. Крэатыўнасць студэнтаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый мэтанакіравана развіваецца ў межах вывучэння бібліятэказнаўчых, агульнапрафесійных дысцыплін, такіх як “Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк”, “Бібліятэчны менеджмент”, а таксама ў ходзе засваення матэрыялу спецкурсаў “Бібліяпсіхалогія”, “PR і рэклама”, “Псіхалогія кіравання”, “Бібліятэчная канфлікталогія” і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інш. Шматгадовы вопыт выкладання адзначаных дысцыплін сведчыць, што для мэтанакіраванага фарміравання крэатыўнасці студэнтаў неабходна, па-першае, існаванне адпаведных арганізацыйна-метадычных умоў, а па-другое, прымяненне праектнага метаду навучання як найбольш перспектыўнага і апраўданага.

Развіццё крэатыўнасці студэнтаў ажыццяўляецца праз разнастайныя формы навучання. У пошуку і апрабацыі іх кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы БДУ культуры і мастацтваў лічыць найбольш эфектыўным комплекснае, сістэмнае выкарыстанне праектнага метаду, які найбольш дакладна садзейнічае праяўленню і замацаванню адзначаных намі арганізацыйна-педагагічных умоў.

З пункту гледжання педагогікі праектны метад вызначаецца як “сукупнасць прыёмаў, дзеянняў навучэнцаў у іх пэўнай паслядоўнасці для дасягнення пастаўленай задачы – вырашэння праблемы, значнай для навучэнцаў і аформленай у выглядзе канчатковага прадукту” [5].

Праектны метад у адукацыі актывізуе пазнавальную дзейнасць навучэнцаў, развівае крэатыўнасць і адначасова садзейнічае фарміраванню пэўных асобасных і прафесійных якасцей. Ён грунтуецца на выкарыстанні тэхналогій развіваючага навучання, накіраваных на фарміраванне рэфлексіўнага мыслення; тэхнікі праблематызацыі, дэпраблематызацыі. Тэхналогіі забяспечваюць самастойнасць, дзейснасць, выніковасць навучання [6]. Менавіта гэты метад дае магчымасць адлюстраваць творчую дзейнасць студэнтаў ад узнікнення задумы, асэнсавання яе ў ідэю-гіпотэзу да пошуку спосабаў рэалізацыі, укаранення ў практыку.

Выходзячы з азначэнняў, дадзеных у педагагічнай і бібліятэчнай энцыклапедыях, а таксама з практычнай дзейнасці бібліятэк, можна тэарэтычна абгрунтаваць сэнс і методыку праектнага навучання студэнтаў. Праектнае навучанне – арганізацыя адукацыйнага працэсу, накіраванага на вырашэнне навучэнцамі вучэбных задач самастойнага збору па зададзеных прыкметах і інтэрпрэтацыю інфармацыі, абавязковае абгрунтаванне і карэкціроўку наступнай прадуктыўнай вучэбнай дзейнасці, яе самаацэнку і прэзентацыю выніку. Навучанне пры гэтым набывае асобасны сэнс, што павышае матывацыю студэнта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Укараненне ў вучэбны працэс метаду праектаў патрабуе з боку выкладчыка добрага ведання тэхналогіі яго распрацоўкі і выкарыстання. Праілюструем гэты працэс больш падрабязна на прыкладзе выкладання курсаў “Бібліятэчны менеджмент” і “Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк”. На лекцыях і семінарскіх занятках па курсе “Бібліятэчны менеджмент” студэнты замацоўваюць веды па праектнай дзейнасці бібліятэк, на практычных занятках разглядаюць розныя праблемныя сітуацыі, удакладняюць мэты, задачы, тэрміны працы над праектамі, распрацоўваюць мадэль мэтавай праграмы. У час практычных заняткаў па курсе “Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк” рэалізуецца частка праекта, які прадугледжвае арганізацыю і правядзенне аднаго або некалькіх масавых мерапрыемстваў. Такім чынам ажыццяўляюцца міжпрадметныя сувязі і развіваюцца крэатыўныя здольнасці студэнтаў, якія атрымліваюць магчымасць у поўнай меры рэалізаваць свой творчы патэнцыял, набыць вопыт работы ў камандзе, апынуцца ў сітуацыі, максімальна набліжанай да ўмоў рэальнай прафесійнай дзейнасці.

Укараненне праектнай методыкі характарызуецца наступнымі этапамі дзейнасці выкладчыкаў і студэнтаў.

1. Вызначэнне тэмы праекта. На гэтым этапе навучанне мае яскрава выражаны практыка-арыентаваны характар, што дазваляе наладжваць і падтрымліваць цесныя сувязі з заказчыкамі – бібліятэкамі. Ужо на гэтым этапе метад праектаў арганічна спалучаецца з метадам навучання, што важна і для праектнай дзейнасці бібліятэк. Тэматыка праектаў узгадняецца са спецыялістамі бібліятэк.

2. Арганізацыя творчых груп. Студэнты аб’ядноўваюцца ў творчыя групы, у кожнай з якіх вылучаецца каардынатар. Ён кіруе і кантралюе ўдзел студэнтаў у распрацоўцы праекта, падтрымлівае сувязі і атрымоўвае кансультацыі ад работнікаў бібліятэк, выкладчыкаў. Для кожнай творчай групы выкладчыкі аб’ядноўваюць заданні вучэбнай і пазавучэбнай, самастойнай работы студэнтаў, арыентуюць іх на супрацоўніцтва. У групах адбываецца размеркаванне абавязкаў з улікам асабістых здольнасцей студэнтаў.

3. Выбар творчымі групамі тэм праектаў. Кожная творчая група разам з метадыстамі, работнікамі аддзелаў абслугоўвання бібліятэк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выбірае тэмы мультыпраектаў, абмяркоўвае магчымыя крыніцы інфармацыі, прагназуе канчатковы вынік дзейнасці.

4. Вызначэнне творчай групай відаў дзейнасці і стварэнне плана рэалізацыі мультыпраекта. Каардынатар групы разам з выкладчыкам (пры неабходнасці) размяркоўвае віды дзейнасці паміж удзельнікамі праекта, пасля чаго група складае план работы над мультыпраектам. Каардынатар прызначае адказных за кожную пазіцыю плана і вызначае тэрмін яго выканання.

5. Рэалізацыя планаў мультыпраектаў. Гэты этап – самы інтэнсіўны і творчы, таму што адбываецца непасрэдная распрацоўка праекта ў бібліятэках. Студэнты назапашваюць інфармацыю, працуюць з ёю, даследуюць праблемы, абмяркоўваюць розныя варыянты афармлення і прадстаўляюць праекты. Кожны ўдзельнік групы ўносіць свой асабісты ўклад у агульную справу. Сумесная работа над праектам дае магчымасць стварэння пазітыўнай узаемазалежнасці студэнтаў і забяспечвае індывідуальную ацэнку работы кожнага ўдзельніка і групы ўвогуле.

6. Прэзентацыя праектаў. Абарона мультыпраекта першапачаткова адбываецца на практычных занятках у студэнцкіх групах. Студэнты разам з выкладчыкамі адбіраюць лепшыя праекты і рэкамендуюць іх для прэзентацыі.

Формай прэзентацыі вызначаецца “круглы стол”, на які запрашаюцца выкладчыкі і прадстаўнікі бібліятэк. Пры абароне праекта ўлічваюцца арыгінальнасць і якасць прадстаўленага матэрыялу, аб’ём і глыбіня ведаў па тэме, эрудыцыя, міжпрадметныя сувязі, культура мовы, выкарыстанне наглядных сродкаў, адказы на пытанні, іх паўната і аргументаванасць.

Праектная методыка дазваляе спалучаць перавагі праектна-даследчага метаду і магчымасці інфармацыйных тэхналогій; ствараць аптымальныя ўмовы для самарэалізацыі як студэнтаў, так і выкладчыкаў; развіваць індывідуальныя патэнцыяльныя здольнасці студэнтаў; арганізоўваць цеснае ўзаемадзеянне і зносіны паміж членамі групы, выкладчыкамі і супрацоўнікамі бібліятэк; фарміраваць і развіваць даследчыя ўменні і навыкі, творчыя здольнасці ўсіх удзельнікаў праекта; засяроджваць увагу як на індывідуальнай працы, так і на супольных дзеяннях падчас вырашэння вытворчых праблем; браць на сябе індывідуальную адказнасць за выкананне вытворчых задач.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прэзентацыі, масавыя мерапрыемствы, якія з'яўляюцца канчатковым вынікам вучэбнай дзейнасці, сведчаць аб эфектыўнасці праектнай методыкі. Студэнты выказваюць задаволенасць ад выканання задання, праяўляюць пачуцці прафесійнай годнасці, пазітыўныя адносіны да сакурснікаў, адчуваюць упэўненасць у сабе, зацікаўленасць у будучай прафесійнай дзейнасці, асэнсоўваюць матывацыю самаактуалізацыі і самаўдасканалення.

Праектны метад развіцця крэатыўнасці студэнтаў дае добрыя вынікі для ўкаранення студэнцкіх ідэй у бібліятэчную практыку, у якой усё большае месца займае праграмна-мэтавая дзейнасць. У літаратуры яна характарызуецца як "распрацоўка дакументных (мэтавых) праграм, канцэпцый, стратэгічных планаў, праектаў, якія вызначаюць магчымыя шляхі дасягнення адной ці некалькіх мэт выканаўцамі пры пэўным рэсурсным забеспячэнні ва ўмовах пераходу да мэтавага кіравання бібліятэкай" [7, с. 826]. Бібліятэказнаўцы класіфікуюць праекты па розных прыкметах: маштабе, змесце, функцыянальным прызначэнні. Так, у маштабе бібліятэкі рэалізуюцца мегапраекты (рэспубліканскага, абласнога, раённага значэння), мультыпраекты (рэалізуюцца на ўзроўні горада, раённага цэнтра), монапраекты (рэалізуюцца адной бібліятэкай), міні-праекты (рэалізуюцца студэнтамі ў час правядзення семінарскіх, практычных і лабараторных заняткаў у выглядзе прэзентацый і масавых мерапрыемстваў).

Такім чынам, для рэалізацыі ў навучальным працэсе канцэпцыі развіцця крэатыўнасці студэнтаў патрабуецца істотная перабудова існуючай педагагічнай сістэмы. Неабходна правядзенне работ па ўкараненні праектных тэхналогій навучання, стварэнні прынцыпова новай метадычнай базы кафедры, увядзенні новых метадаў і арганізацыйных форм навучання студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Коджаспирова, Г.М.* Педагогический словарь / Г.М.Коджаспирова, А.Ю.Коджаспиров. – М.: Академия, 2000. – 176 с.

2. *Долматов, А.В.* Основы развивающего образования: теория, методы, технологии креативной педагогики / А.В.Долматов. – СПб.: ВУС, 1998. – 196 с.

3. *Чернилевский, Д.В.* Креативная педагогика и психология / Д.В.Чернилевский, А.В.Морозов. – М.: МГТА, 2001. – 301 с.

4. *Халперн, Д.* Психология критического мышления / Д.Халперн; пер. с англ. – СПб.: Питер, 2000. – 512 с.

5. *Метод* проектов [Электронный ресурс] // Режим доступа: http: // Wikipedia. org / wiki.

6. *Новые* педагогические информационные технологии в системе образования: учеб. пособие / под ред. Е.С.Полат. – М.: Академия, 2001. – 154 с.

7. *Библиотечная* энциклопедия. – М.: Пашков дом, 2008. – 1230 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ